# ПРАВАПІС СКЛАДАНЫХ ПРЫМЕТНІКАЎ ІТ-ТЭМАТЫКІ

*Казак М.А., Хорын У.А.*

*Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт інфарматыкі і радыёэлектронікі*
*г. Мінск, Рэспубліка Беларусь*

*Албут А.А. – старшы выкладчык*

Разглядаюцца цяжкія пытанні правапісу складаных прыметнікаў у навуковым стылі на прыкладзе паняццяў, актуальных у сферы ІТ. Прапанаваны алгарытм разважання пры выбары напісання прыметнікаў асобна і праз злучок.

У наш час іншамоўныя тэрміны займаісць усё большуіс частку нашага жыцця. І часцяком, выкарыстоўваісчы іх, мы нават не задумваісчыся аб іх напісанні. Мноства тэрмінаў-словазлучэнняў і складаных слоў пераймаісцца з рускай мовы (звычайна шляхам калькавання) з выкарыстаннем малавядомых большасці правіл. Часта тэрміны, у складзе якіх ёсць склданыя прыметнікі, мы пішам па ўзоры, падгледзеўшы дзесьці чыйсьці прыклад і не разумеісчы правіла, моўнуіс логіку. Мыз вярнулі ўвагу на пытанне правапісу складаных прыметнікаў, што сустракаісцца ў прафесійным іТ-маўленні.

***Аб’ектна/арыентаваная*** *мова праграмавання*; ***кантэксна/залежныя*** *вылічэнні*; ***абсалютна/непарыўнае*** *размеркаванне*; ***часткова/рэкурсіўная*** *функцыя* – асобна ці праз злучок пішуцца выдзеленыя прыметнікі?

Прывядзём фармулёўку правіла:

1) пішам асобна, калі другая частка – **дзеепрыметнік** або **якасны прыметнік**, тады з ёй у пераважнай большасці спалучаецца прыслоўе: *максімальна адкрыты*, *нейтральная афарбаваны*, *публічна абаронены*, *нераўнамерна размеркаваны*, *папулярна выкладзены*, *нядаўна выдадзены*; *падкрэслена ветлівы*, *параўнальна рэдкі*, *параўнальна малады*, *пастаянна вільготны*, *патэнцыяльна небяспечны*, *семантычна блізкі*;

2) пішам праз злучок, калі другая частка – **адносны прыметнік**, а першая частка прыслоўем з'яўляцца не можа: *рамантычна-ідэалістычны*, *раўнамерна-крывалінейны*, *рэкламна-выдавецкі*, *санітарна-каранцінны*, *святочна-абрадавы*, *сістэмна-фразеалагічны* [1].

Такім чынам, прапанаваны крытэрый (улік формы слова і лексіка-граматычнага разрада прыметніка) сапраўды дазваляе зразумець і запомніць, што *параўнальна бяспечны*, *сацыяльна абмежаваны*, *прамыслова важны* пішам асобна, а *параўнальна-гістарычны*, *сацыяльна-культурны*, *прамыслова-даследчы* – праз злучок. Сфармуляванаму правілу падпарадкоўваецца прынятае асобнае напісанне ***абсалютна непарыўнае*** *размеркаванне*. Але ж і прынятым з’яўляецца асобнае напісанне ***часткова рэкурсіўная*** *функцыя* (у той час як пішам разам ***агульнарэкурсіўная*** *функцыя*), але *рэкурсіўны* – адносны прыметнік. Асобна пішам і ***рэкурсіўна пералічальнае*** *мноства* [2]. Супярэчнасць гэту можна патлумачыць, калі ўлічыць, што *пералічальны* – адзеяслоўны прыметнік, а назоўнік *рэкурсія* называе апісанне, выяву пэўнага аб’екта ўнутры самога аб’екта; паводзіны функцыі, калі яна выклікае сама сябе. Тады прыслоўе можа тлумачыць якасць,заснавануіс на дзеянні, стане, працэсе, і пісацца асобна.

***Аб’ектна-арыентаваная*** *мова праграмавання*, ***кантэксна-залежныя*** *вылічэнні* патрабуісць напісання праз злучок. Зноў правіла не працуе? Працуе, але іншае. Успомнім фармулёўку правапісу ў адно слова для складаных прыметнікаў: разам пішуцца прыметнікі, якія суадносяцца са словазлучэннямі з падпарадкавальнай сувяззіс: *двухразовы*, *сельскагаспадарчы*, *чарнабровы* [3]. Адзначым, што ва ўтваральных словазлучэннях выражаны азначальныя адносіны: *два разы*, *сельская гаспадарка*, *чорныя бровы*. Паспрабуем

рэканструяваць утваральныя словазлучэнні для першых прыкладаў: *арыентаваны* ***на*** *аб'ект*, *залежны* ***ад*** *кантэксту*. Гэтыя словазлучэнні выражаюць аб'ектныя адносіны, а ў вытворным складаным прыметніку злучок, можна сказаць, замяняе прыназоўнік.

Навуковыя паняцці, тэрміны, у тым ліку і ў сферы IT, якія утрымліваюць прыметнікі, дзеепрыметнікі, прыслоўі могуць выклікаць цяжкасць у напісанні. Вядома, добра, калі можна звярнуцца да нарматыўнага слоўніка па даведку, аднак не заўсёды гэта магчыма. Разуменне логікі ўтварэння намінацыі з прыметнікам, вызначэнне лексіка-граматычных, словаўтваральных асаблівасцей можа дзейсна дапамагчы вырашыць арфаграфічныя цяжкасці.

***Спіс выкарыстаных крыніц:***

*1. Кулiковiч, У. I. Арфаграфiя. Матэрыялы для падрыхтоўкі да цэнтралізаванага тэсціравання : дапаможнік для вучняў агульнаадукацыйных устаноў / У. І. Куліковіч. – Мазыр : Белы Вецер, 2010. – 59 с.*

*2. Матэматычная энцыклапедыя / гал. рэд. В. Бернік. – Мінск : Тэхналогія, 2001. – 496 с.*

*3. Правілы беларускай арфаграфіі і пунктуацыі – Мінск : Нац. цэнтр прававой інфарм. Рэсп. Беларусь, 2008. – 144 с.*